АБ УСІМ,ШТО БАЛІЦЬ

№46/53/--12.XI.1976

МЕНСК

ТОЛЬКІ ГУТАРКА ХОДЗІЦЬ ТАКАЯ...

Я.КУПАЛА

# Г У Т А Р К А

## ТАБЕ ПАТРЭБНА ВОЛЯ

Каб зніклі ўсе нягоды
І красавала доля,
Запомні назаўсёды:
Табе патрэбна ВОЛЯ!

Каб буйна год за годам
Радзіла тваё поле,
Запомні назаўсёды:
Табе патрэбна ВОЛЯ!

Каб фабрыкі,заводы
Далі ўсяго даволі,
Запомні назаўсёды:
Табе патрэбна ВОЛЯ!

Каб у сям"і народаў
Не чуў зняваг ніколі,
Запомні назаўсёды:
Табе патрэбна ВОЛЯ!

[redacted]

Курган Славы.

У нас валатовак шмат на дзіва,
І ім заўсёды з намібыць,
А ён узвысіўся пыхліва,
Каб іх ад нас адгарадзіць

У валатоўках—продкаў вої,
Што ад палону бераглі,
А ён праз тых, што быццам волю,
Нам нёслі, зноў нас запраглі

Глядзі: дубы, бярозы, сосны
На валатоўках парасліі.
З яго ж штыкі пачварна-грозным
Крывавым прывідам ўзышлі

У валатоўках—наша слава,
Нам кліч геройскі на ўвесь час!
А ён ў імя чужой нам справы,
Як ікал, выстаўлен для нас.

Чужыя кветкI у нашым полI,
Чужыя зоркI у нашым небе.
Чужыя кветкI нам душы труцяць,
Чужыя зоркI нас з тропу зводзяць.
Чужыя кветкI хутчэй мы вырвем,
Чужыя зоркI смялей мы згасIм.
Свае мы кветкI засеем у полI,
Свае Свае мы зоркI запалIм у небе.
Свае нам кветкI душу уваскрасяць,
Свае нам зоркI шляхI пакажуць.

О, Беларусь, ў цябе нямала
Было адданнейшых сыноў,
Што ў бой ішлі з чужой навалай,
Што рвалі путы ланцугоў.

Але для нас, доўгацярплівых,
Ў няволі звыклых вечна жыць,
Іх, мужных, прыклад быў жахлівы
/Рабом лягчэй, чым вольным быць!/

І мы іх самі аддавалі
У рукі ворагаў сваіх,
Каб на крыжы іх распіналі,
Каб у гразі таптлі іх.
~~А нам за нашу подласць здраду~~
А нам за нашу подласць-здраду
Плацілі горшым шчэ ярмом,
Свісталі больш нагайкі катаў
Над нашым схіленым гарбом.

Радзіма пеклам для нас стала,
І мы за здраду церпім боль...
...У нас Хрыстоў было нямала,
Але Іудаў яшчэ больш.